***Тамара Тарасава***
*(Мінск)*

# МІХАСЬ МУШЫНСКІ – МАШТАБНЫ ДАСЛЕДЧЫК СПАДЧЫНЫ МАКСІМА ГАРЭЦКАГА

Унёсак Міхася Іосіфавіча Мушынскага ў даследаванне творчай спадчыны Максіма Гарэцкага не проста вялікі, ён маштабна фундаментальны. Гэта і грунтоўная акадэмічная манаграфія «Падзвіжнік з Малой Багацькаўкі: Жыццёвы і творчы шлях Максіма Гарэцкага» (2008; 2013), навуковыя артыкулы і каментарыі да Збору твораў беларускага класіка, прадмовы да кніг пра М. Гарэцкага, шматгадовы ўдзел у Гарэцкіх чытаннях і інш.

Увага М.І. Мушынскага да творчых здабыткаў М. Гарэцкага была абумоўлена глыбокім разуменнем таго, што, “не ўдакладніўшы месца М. Гарэцкага ў агульным працэсе развіцця беларускай і беларускай савецкай літаратуры, – як пісаў А. Адамовіч, – немагчыма правільна ўбачыць і ацаніць сам гэты працэс” [1, с. 44]. Міхась Мушынскі, падхапіўшы справу А. Адамовіча ў даследаванні спадчыны беларускага пісьменніка, сфарміраваў у нацыянальным літаратуразнаўстве разам з Радзімам Гаўрылавічам Гарэцкім сур’ёзную навуковую школу – гарэцказнаўства, якая стала “арганічным складнікам айчыннай навукі пра нацыянальнае прыгожае пісьменства” [7, с. 28].

Падрыхтоўка да друку Збору твораў у 4-х тамах (1984–1986), дадатковага тома Творы (1990) і “Гісторыі беларускае літаратуры (1992) М. Гарэцкага была справай адказнай: яна, як і ўся праца М. Мушынскага ў аддзеле тэксталогіі, вымагала такі ўзровень навукова-тэарэтычнага асэнсавання аўтарскага тэксту, вывучэння гісторыі яго напісання, які становіцца універсальным ключом да інтэрпрэтацыі зместу твораў пісьменніка наогул. Вучоны быў прыхільнікам даследавання мастацкіх твораў “у кантэксце агульнай эвалюцыі светапогляду пісьменніка, у кантэксце яго ідэйна-эстэтычных пошукаў” [3, с. 354].

Навуковец М. Мушынскі плённа засвойваў лепшыя на той час здабыткі расійскай фундаментальнай тэксталагічнай навукі, і гэта спрыяла шматвектарным падыходам да вывучэння літаратурнага працэсу на Беларусі, дакладнаму вызначэнню ролі і месца нацыянальнага пісьменніка ў ім. Выдадзены Збор твораў М. Гарэцкага засведчыў арыгінальнае і глыбокае разуменне М.І. Мушынскім прыроды мастацтва слова, яго вялікага выхаваўчага патэнцыялу:“…Гарэцкі ўмее паказаць дынаміку падзеі, яе развіццё, рух. Ён удала пазбягае статыкі. Яго апісанні вельмі пластычныя, аб’ёмныя. Апавядальная плынь цячэ нязмушана, натуральна – як само жыццё. А якія трапныя, ёмістыя, дакладныя азначэнні знаходзіць М. Гарэцкі! Як тонка адчувае ён слова, яго адценне” [3, с. 356].

Усё напісанае М.І. Мушынскім глыбока і арганічна звязана з маральнымі праблемамі часу, савецкага, перабудовачнага, постперабудовачнага. Вывучаючы творчасць і жыццёвы шлях М. Гарэцкага,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Мушынскі-вучоны падкрэсліваў цесную знітаванасць маральна-этычнай праблематыкі твораў беларускага пісьменніка з яго сапраўдным патрыятызмам, служэннем Беларусі нават у самыя неспрыяльныя часы: “Пазіцыя Гарэцкага блізкая поглядам рэвалюцыйна-дэмакратычных пісьменнікаў. Ён рашуча бароніць народнасць і рэалістычныя асновы літаратуры, моцнай сваёй сувяззю з рэальным жыццём. <…> Ён не прымае літаратуры ўяўна бадзёрай, ружовай, павярхоўна-заклікальнай. Гэтак жа чужымі аказваюцца для Гарэцкага і парады тых, хто хацеў бы, каб нашай літаратуры былі ўласцівы “свае асобна-карысныя дамаганні і законы”. Такія “законы” здольны падарваць літаратуру, загубіць яе. Гарэцкі выступае за глыбокае, арганічнае спалучэнне нацыянальнай праблематыкі і «агульна-чалавечых пытанняў»” [3, с. 367].

Работы вучонага па даследаванню спадчыны М. Гарэцкага маюць вялікае значэнне для нацыянальнай самаідэнтыфікацыі беларусаў, для адраджэння беларускага патрыятызму праз глыбокае вывучэнне аўтарскай пазіцыі Гарэцкага-пісьменніка. Не страціла актуальнасці для сённяшняга часу і праблема беларускай інтэлігенцыі, канцэптуальна даследаваная М. Мушынскім у мастацкай і публіцыстычнай творчасці М. Гарэцкага. Даследчык М. Мушынскі раскрываў глыбінную сутнасць, грамадскі патэнцыял герояў-інтэлігентаў М. Гарэцкага, якія, як адзначаў вучоны, “выпадалі з сістэмы ідэалізаваных, аднапланавых герояў” [6, с. 475].

Любімым героем М.Мушынскага ў творчай спадчыне М. Гарэцкага быў вясковы герой-інтэлігент, “ціхі думаннік”, маўклівы філосаф, летуценны рамантык, які баіцца “балбатні”, гучных слоў: “М. Гарэцкі ўзняўся над спрошчанай трактоўкай вобраза інтэлігента, якога беспадстаўна крыўдзіць, не разумее цёмная, адсталая вёска: герой яго апавяданняў – і ў гэтым бясспрэчнае наватарства пісьменніка – пачынае ўсведамляць дваістасць уласнага становішча як “прымака ў панстве” і “пасынка вёскі” [5, с. 382]. Мушынскі-вучоны дакладна фармулюе базавыя канстанты гэтага вобраза: “прымак у панстве”, “пасынак вёскі”, асветнік, нацыянальна свядомы, схільны да рэфлексіі, “абаронца гуманізму і духоўных асноў жыцця”, “летапісец гісторыі народа” [5, с. 406].

Каштоўнасць працы Мушынскага-тэкстолага заключаецца не толькі ў захаванні культурнай спадчыны беларускіх пісьменнікаў, а і ў тым, што літаратуразнаўчыя працы М. Мушынскага стануть высокім класічным узорам навуковых даследаванняў увогуле, дзе арганічна сышліся навуковы аналіз, публіцыстыка і эсэістыка. Сёння з упэўненасцю можна гаварыць аб шматжанравасці яго работ: навуковыя манаграфіі, рэдактарскія прадмовы, каментарыі да літаратурных помнікаў, публіцыстычныя нататкі, рэцэнзіі і інш. Для М.І. Мушынскага літаратурны тэкст быў той базавай велічынёй, трывалым падмуркам, на якіх павінна грунтавацца навуковая канцэпцыя вучонага. У аснове літаратуразнаўчых поглядаў беларускага вучонага ляжаў сістэмны падыход, які інтэграваў вялікі комплекс ведаў па культуры ў цэлым. Працэс развіцця беларускай літаратуры даследчык разглядаў у цеснай узаемасувязі з гісторыка-культурнай сітуацыяй у краіне. Яго навуковыя

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

працы выяўляюць спецыфіку і асаблівасці нацыянальнай культуры, у якой спалучаны праблемы філалогіі і мастацтвазнаўства, філасофіі, гісторыі і сацыялогіі культуры. Літаратуразнаўчыя працы даследчыка сталі эталонам навуковасці, культурнасці, духоўнасці.

Асоба Мушынскага-вучонага фарміравалася ў асяроддзі лепшых постацей нацыянальнай культуры (І. Мележ, У. Караткевіч, В. Быкаў, А. Адамовіч, Я. Брыль і інш.). Менавіта творчасць гэтых майстроў слова прываблівала М. Мушынскага сваім гуманістычным зместам, высокім маральна-этычным патэнцыялам, а зварот да лепшых узораў класічнай спадчыны даваў магчымасць бачыць карані, тэндэнцыі (нацыянальныя і сусветныя) развіцця нацыянальнага прыгожага пісьменства.

Комплексны і шматмерны падыход да вывучэння мастацкіх твораў Гарэцкага-пісьменніка, яго творчай спадчыны ўвогуле запатрабаваў ад вучонага спалучэння многіх метадаў гуманітарных дысцыплін: гістарычных, семіятычных, кампаратывісцкіх і інш. Энцыклапедычныя веды М. Мушынскага давалі яму магчымасць аналізаваць беларускую літаратуру ў дынаміцы яе станаўлення, з улікам яе традыцый і наватарства, падмурак якіх закладвалі ў свой час Янка Купала, Якуб Колас, М. Багдановіч, М. Гарэцкі і інш.

Мушынскі-даследчык глядзеў на М. Гарэцкага як на асобу "шырокага творчага дыяпазону – таленавіты мастак слова, адзін з пачынальнікаў беларускай прозы, буйны вучоны, гісторык і тэарэтык літаратуры, палымяны публіцыст, нястомны змагар за нацыянальнае адраджэнне, клапатлівы педагог, арганізатар літаратурнага руху, лексікограф, перакладчык, збіральнік і прапагандыст вуснай народнай творчасці" [5, с. 381]. М.І. Мушынскі ўпершыню ў беларускім літаратуразнаўстве загаварыў аб творчай спадчыне М. Гарэцкага як аб **цэласнай мастацкай сістэме**: "Нягледзячы на выключна цяжкія ўмовы жыцця ў ссылцы, М. Гарэцкаму ўдалося напісаць змястоўны раман (гаворка ідзе пра "Віленскія камунары" – *Т.Т.*), які з'яўляецца арганічным кампанентам *мастацкай сістэмы, выпрацаванай папярэднімі творамі* (выдзелена намі – *Т.Т.*)" [5, с. 413]. Асобныя элементы гэтай **цэласнай мастацкай сістэмы** (інтэлектуальная філасофская проза, экзістэнцыяльны кампанент твораў М. Гарэцкага, наратыўныя стратэгіі беларускага аўтара, жанравае багацце прозы пісьменніка і інш.) будуць вывучацца вучнямі-паслядоўнікамі М.І.Мушынскага.

Сёння па праву можна гаварыць пра культуралагічны аспект філалагічных прац М.І. Мушынскага, бо культуралагічныя рэфлексіі ў навуковым мысленні вучонага дапаўняюць літаратуразнаўчыя і ўзаемаўзбагачаюцца. Узорнымі ў гэтым плане сталі кнігі «Падзвіжнік з Малой Багацькаўкі: Жыццёвы і творчы шлях Максіма Гарэцкага», «Нескароны талент: Праўдзівая гісторыя жыцця і творчасці Міхася Зарэцкага»).

Мушынскі-вучоны ўмела спалучаў у сваіх даследаваннях шматлікія метады: тыпалагічны, гісторыка-функцыянальны, гісторыка-генетычны, сістэмна-структурны, семіятычны, параўнальна-гістарычны. Пры гэтым ён перасцерагаў, што празмернае захапленне заходнееўрапейскімі метадалогіямі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

можа быць і небяспечным, калі ігнаруется нацыянальная спецыфіка развіцця літаратуры. Кніга «І нічога, апроч праўды: Якой быць „Гісторыі беларускай літаратуры“» паказала, што “Гісторыю літаратуры” М. Мушынскі ўспрымаў як самастойную навуковую дысцыпліну, дзе павінны быць і тэарэтычныя абагульненні (перыядызацыя, жанравыя змены) і элементарныя звесткі пра аўтараў і іх творы. Такое спалучэнне, як лічыў даследчык, паспрыяе папулярызацыі літаратуры і літаратуразнаўства і зацікавіць тых, хто хоча пашырыць свае веды пра літаратурны працэс, яго рух у гістарычнай перспектыве.

Распрацоўка тэарэтычнай базы для “Гісторыі беларускай літаратуры XX стагоддзя” – задача не з лёгкіх: трэба было захаваць прынцып гістарызму, спалучыць у аналізе звесткі пра аўтара і яго творы, улічыць асноўныя тэндэнцыі літаратурнага працэсу як з’явы заканамернай. Кніга-канцэпцыя «І нічога, апроч праўды: Якой быць „Гісторыі беларускай літаратуры“» (1990) стала метадалагічнай асновай **гісторыі літаратуры** як самастойнай сістэмы філалагічных ведаў. М. Мушынскі даў у кнізе тэарэтычнае абгрунтаванне “Гісторыі беларускай літаратуры XX стагоддзя”, і варта заўважыць, што гэта ажыццяўлялася ў час крызісу метадалогіі сусветнага літаратуразнаўства, якая сваім імкненнем да матэматычнай дакладнасці аддалялася ад літаратурных крыніц (папулярызацыя інтэрпрэтацыі тэксту без апоры на гісторыка-культурны кантэкст, ігнараванне фігуры аўтара і іншыя нелітаратуразнаўчыя падыходы).

У кнізе “І нічога, апроч праўды…”М. Мушынскі засведчыў, што ён прыхільнік такога тыпу даследавання літаратуры, дзе арганічна спалучаны і элементарныя звесткі пра аўтара і літаратуразнаўчы аналіз яго твораў, і часам нават сціслы сюжэтны пераказ тэксту. Раздел пра М. Гарэцкага ў “Гісторыі беларускай літаратуры XX стагоддзя” выявіў прыярытэтныя метадалагічныя ўстаноўкі даследчыка: высветліць прычыны ўзнікнення тых ці іншых з’яў, светапоглядную канцэпцыю пісьменніка, адметнасці нацыянальнага літаратурнага працэсу ў параўнанні з іншымі літаратурамі. Менавіта такі падыход забяспечваў сістэмнасць поглядаў на літаратуру, а літаратуразнаўству як навуцы аўтарытэт і навуковасць.

У трактоўцы творчасці М. Гарэцкага ў “Гісторыі беларускай літаратуры XX стагоддзя” М. Мушынскі аддае перавагу гістарычнаму (не храналагічнаму) прынцыпу размяшчэння матэрыялу. Чаму? Тут вучоны выступае паслядоўнікам канцэпцыі расійскага даследчыка Д. Ліхачова, які пісаў: “«…Исследуя процесс, нельзя … располагать весь материал в строго хронологическом порядке. Иногда корни нового явления уходят глубоко в прошлое, и тогда исследователь должен возвращаться назад. Гораздо чаще явление, ярко проявившееся в определенное время, в дальнейшем остается, как бы “застревает” в литературе и продолжает в ней жить и претерпевать различные изменения. Это связано с тем, что история культуры есть не только история изменений, но и история накопления ценностей, остающихся живыми и действенными» [2, с. 26]. Так, аналізуючы “Запіскі на імперыялістычнай вайне” і “Віленскія камунары”, даследчык згадвае і

РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ

рускую мастацкую прозу, і заходнееўрапейскую, і багушэвічаўскую традыцыю. Такая <u>гістарычная</u> перспектыва падкрэслівае сэнс пэўных эпох у развіцці беларускай літаратуры. Менавіта гістарычны прынцып найглыбей праявіўся ў падыходзе беларускага вучонага да навукова абгрунтаванай перыядызацыі літаратурнага працэсу XX стагоддзя.

У кнізе “І нічога, апроч праўды…”Міхась Іосіфавіч выразна сфармуляваў гісторыка-тэарэтычны падыход, які даваў магчымасць будаваць “Гісторыю беларускай літаратуры XX стагоддзя” як гісторыю развіцця літаратуры ў руху, улічваючы яе чыста базавыя літаратурныя канстанты, ролю літаратуры ў краіне, яе ўзаемадзеянне з іншымі відамі мастацтва. Толькі праз такі падыход, на думку вучонага, мы можам зразумець нацыянальныя своеасаблівасці мастацтва слова.

Пабудова гісторыі літаратуры праз персаналіі пісьменнікаў, у гэтым можна ўбачыць пэўны знак-канцэпцыю Мушынскага-даследчыка, сутнасць якой заключаецца ў каштоўнасці аўтарскай індывідуальнасці ў літаратуры. Яго манаграфічны раздзел пра М. Гарэцкага даказаў гэта ў поўнай ступені. Аўтарская індывідуальнасць М. Гарэцкага, паводле меркаванняў М. Мушынскага, праяўлялася ва ўсім – тэме, стылі, жанравых формах, у яго падыходах да вывучэння гісторыі беларускай літаратуры (“Гісторыя беларускае літаратуры”). Даследчык пісаў: “Яго (Гарэцкага – *Т.Т.*) намаганні скіраваны на раскрыццё ўсяго складанага комплексу чалавечых пачуццяў, дзе ў супярэчлівае адзінства зліваюцца свядомае і падсвядомае, рацыянальнае і інтуітыўнае. Пісьменнік не ўхіляўся ад таго, каб расказаць аб прарочым сне салдата, каб перадаць прадчуванні чалавека перад смерцю, трызненні параненага, паміраючага. Для Гарэцкага-пісьменніка не існавала забароненых тэм і сітуацый. Ён выступае … як сапраўдны рэаліст, даследчык і першаадкрывальнік новага ў сферы ўнутранага жыцця чалавека” [4, с. 351].

Мушынскаму-вучонаму імпанавала стаўленне Гарэцкага-творцы да літаратурнай крытыкі і навуковых даследаванняў, на якія пісьменнік глядзеў “як на форму самаўсведамлення літаратуры”: “Метадалагічнае значэнне крытычных артыкулаў і выступленняў Гарэцкага яшчэ і ў тым, што яны актыўна замацоўвалі найболей перспектыўны кірунак развіцця крытычнай думкі, шляхі і сродкі вывучэння мастацкага твора, г. зн. замацоўвалі метад сацыялагічнага і эстэтычнага аналізу ў іх адзінстве і ўзаемасувязі” [6, с.493]. Ідэя метадалагічнага балансу ў поўнай ступені вытрымана М. Мушынскім у падыходах да вывучэння творчасці М. Гарэцкага. Гэтыя падыходы сталі ўзорам навуковай этыкі ў літаратуразнаўчых даследаваннях, яны ёсць яго запавет новым пакаленням навукоўцаў.

Міхась Іосіфавіч у поўнай ступені валодаў харызмай вучонага-гуманітарыя, яго аўтарытэт як даследчыка творчай спадчыны М. Гарэцкага бездакорны. Штогод удзельнічаў Міхась Іосіфавіч у Гарэцкіх чытаннях, ды не проста ўдзельнічаў, ён быў руплівым арганізатарам, генератарам навуковых ідэй, задаваў творчы імпульс гарэцказнаўству. Ён вызначыў шляхі развіцця гарэцказнаўчых даследаванняў, сфармуляваў праграму развіцця гарэцказнаўства на будучыню. Вучоны раіў вывучаць творчасць беларускага

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

пісьменніка з улікам спадчыннай традыцыі роду Гарэцкіх і лічыў матэрыялы канферэнцый "Гарэцкія чытанні" "сапраўднай навуковай бібліятэкай, якая … будзе годна ацэнена … паслядоўнікамі" [7, с. 29]. І сапраўды, гарэцказнаўчая школа сёння мае багаты навуковы патэнцыял, каб "праз вывучэнне творчасці М. Гарэцкага, – як марыў Міхась Іосіфавіч, – можна было б выявіць істотныя заканамернасці гісторыка-літаратурнага працэсу ў еўрапейскай і сусветнай літаратуры" [7, с. 30].

**Літаратура**


1. Адамовіч, А. Класік беларускай літаратуры / А. Адамовіч // Гарэцкі, М. Збор твораў : у 4 т. / М. Гарэцкі ; рэдкал.: А.М. Адамовіч [і інш.] ; Акад. навук БССР, Ін-т літ. імя Я. Купалы. – Мінск : Маст. літ., 1984–1986. – Т. 1 : Апавяданні, 1913–1930 / рэд. С.А. Андраюк ; падрыхт. тэкстаў і камент. М.П. Кенькі. – 1984. – С. 7–44.

2. Лихачев, Д. Развитие русской литературы X––XVII веков / [Электронный ресурс] / Д. Лихачев. – Режим доступа : http://www.litra.ru/fullwork/get/woid/00268301234971688254 – Дата доступа : 01.04.2019.

3. Мушынскі, М. Каментарыі / М. Мушынскі // Гарэцкі, М. Збор твораў : у 4 т. / М. Гарэцкі ; рэдкал.: А.М. Адамовіч [і інш.] ; Акад. навук БССР, Ін-т літ. імя Я. Купалы. – Мінск : Маст. літ., 1984–1986. – Т. 2 : Аповесці. Драматычныя абразкі / рэд. М.І. Мушынскі ; падрыхт. тэкстаў і камент.: Т.С. Голуб, М.П. Кенькі. – 1985. – С. 354–374.

4. Мушынскі, М. Каментарыі / М. Мушынскі // Гарэцкі М. Збор твораў : у 4 т. / М. Гарэцкі ; рэдкал.: А.М. Адамовіч [і інш.] ; Акад. навук БССР, Ін-т літ. імя Я. Купалы. – Мінск : Маст. літ., 1984–1986. – Т. 3 : На імперыялістычнай вайне ; Віленскія камунары / рэд. М.І. Мушынскі ; падрыхт. тэкстаў і камент.: Т.С. Голуб, В.Ю. Дэконскай. – 1985. – С.347–369.

5. Мушынскі, М. Максім Гарэцкі / М. Мушынскі // Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя : у 4 т. / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы ; навук. рэд.: І.Я. Навуменка, В.А. Каваленка. – Мінск, Беларус. навука,1999. – Т. 1 : 1901–1920. – С. 381–426.

6. Мушынскі, М. На пераломе эпох / М. Мушынскі // Гарэцкі, М. Творы. Дзве душы : аповесць ; Апавяданні ; Жартаўлівы Пісарэвіч : п'еса ; Літаратурная крытыка і публіцыстыка ; Лісты / М. Гарэцкі ; уклад. і камент. Т.С. Голуб ; рэдкал.: А.М. Адамовіч [і інш.] ; Акад. навук БССР, Ін-т літ. імя Я. Купалы. – Мінск : Маст. літ., 1990. – С. 475–482.

7. Мушынскі, М. Роздум пра заўтрашні дзень гарэцказнаўства / М. Мушынскі // Максім і Гаўрыла Гарэцкія: жыццё і творчасць (да 100-годдзя першай і75-годдзя другой сусветных войнаў) : матэрыялы XXII Гарэцкіх чытанняў / Дзярж. музей гісторыі бел. літ., Рэспубліканскі фонд імя братоў Гарэцкіх, Цэнтр даследав. бел. культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі; адказны рэдактар Р. Гарэцкі. – Мінск : выд. В. Хурсік, 2014. – С. 28–33.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# СЕКЦЫЙНЫЯ ПАСЯДЖЭННІ

## ДАКЛАДЫ

***Таццяна Вабішчэвіч***
*(Мінск)*

## СІМПТАМАТЫКА НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ТРАЎМЫ Ў АПОВЕСЦІ "ДЗВЕ ДУШЫ" МАКСІМА ГАРЭЦКАГА

У другой палове 1919 г. у ваеннай Вільні, падпарадкаванай тады польскім уладам, пабачыла свет празаічная кніга з інтрыгоўнай, амаль містычнай назвай – "Дзве душы". Выданне складала аднайменная аповесць – новы твор маладога (дваццацішасцігадовага), але ўжо прызнанага майстрам псіхалагічнай прозы пісьменніка-"нашаніўца" Максіма Гарэцкага, напісаны на грунце актуальных гістарычных падзей – двюх рэвалюцый, Грамадзянскай вайны і разгортвання на тэрыторыі толькі што зніклай з карты свету царскай імперскай Расіі палітыкі ваеннага камунізму. Аповесць, дзе М. Гарэцкі з уласцівым яму ўменнем пераплёў нацыянальнае і агульначалавечае, палітычнае і метафізічнае, індывідуальна-біяграфічнае і калектыўна-народнае, чакаў незвычайны лёс: яна неаднойчы станавілася прадметам дыскусій, атрымлівала самыя разнапланавыя, у тым ліку невысокія ацэнкі, прайшла праз працяглае – у некалькі дзесяцігоддзяў – забыццё, забароны і негацыю, каб потым, напрыканцы XX ст., ужо ва ўмовах новага ўздыму беларускага нацыянальнага адраджэння, быць сенсацыйна пераадкрытаю і ўрэшце здабыць статус вузлавога, знакавага тэксту не толькі для спадчыны самога М. Гарэцкага, але і для ўсяго беларускага мыслення XX ст.

Спатрэбілася амаль стагоддзе, каб разгледзець і ўсвядоміць маштабнасць задумы Максіма Гарэцкага, філасофскую і культуралагічную значнасць яго неардынарнага, "загадкавага" (П. Васючэнка) твора і нібыта "двудушнага", але пры гэтым узорна сумленнага (нават у самым складаным – перад самім сабою) героя –Ігната Абдзіраловіча. Рэвалюцыйная рэчаіснасць, адлюстраваная ў "Дзвюх душах", стала фонам, на якім як ніколі выразна і востра загучалі ключавыя для празаіка-мысляра пытанні пра спецыфіку беларускага шляху і беларускага руху, асаблівасці беларускага нацыянальнага характару і (што больш прыватна, але таксама істотна) псіхалагічнае самапачуванне носьбітаў беларускай ідэі і іх антаганістаў, пра драматычнасць асабістых лёсаў тых, хто ў пачатку XX ст. станавіўся на шлях беларускай нацыянальна-будаўнічай працы.

Крывавы, ірацыянальны ў сваёй трагічнасці сацыяльны кантэкст, у якім паўсталі "Дзве душы", наклаў прыкметны адбітак на паэтыку твора. Пры вонкавай стрыманасці і ўзважанасці пісьма тэкст (гэта ўскосна засведчылі сваімі крытычнымі заўвагамі ўжо першыя рэцэнзенты аповесці – Змітрок Бядуля [3] і Антон Луцкевіч [7]) усё ж пакідае неадназначнае ўражанне

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ